УДК 272:94(476.5)

# Гісторыя касцёла і парафіі Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску

***Лаўрыненка К.В.***
*Люблінскі каталіцкі ўніверсітэт Яна Паўла II, Люблін (Польшча)*

*Гісторыя касцёла і парафіі Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску з'яўляецца неад'емнай часткай гісторыі Рымска-каталіцкага Касцёла на Беларусі.*

*Мэта артыкула – разгледзець ролю і месца касцёла і парафіі Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску.*

***Матэрыял і метады.*** *Даследаванне пабудавана на выкарыстанні шырокага кола дакументаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і крыніц, выдадзеных Рымска-каталіцкім Касцёлам, а таксама навуковых публікацый, што дазволіла рэканструяваць гісторыю касцёла і парафіі Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску. Метадалагічную аснову склалі прынцыпы гістарызму і аб'ектыўнасці. У даследаванні выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя (гістарычны і лагічны, аналіз і сінтэз), так і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны) метады.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Першы касцёл Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску быў пабудаваны ў XVII стагоддзі як кляштарны касцёл бернардзінцаў. Каменны касцёл у стылі барока з'явіўся ў XVIII стагоддзі. У XIX стагоддзі пасля ліквідацыі кляштара бернардзінцаў касцёл стаў парафіяльным. Трагічным быў лёс святыні ў XX стагоддзі. Практычна ўсе святары, якія служылі ў касцёле пасля 1917 года, былі рэпрэсіраваныя і расстраляныя. У 1938 г. парафія спыніла сваё існаванне. У пасляваенны час касцёл паступова разбураўся, у выніку ён быў зняты з дзяржаўнага ўліку як помнік архітэктуры, а ў 1958 годзе ўзарваны. У 2001 годзе парафія Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску ўзнавілася.*

***Заключэнне.*** *Пробашч парафіі касцёла Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску з 2003 г. ксёндз Алег Буткевіч будаваў планы па ўзнаўленні велічнага храма ў цэнтры Віцебска. Калі ён стаў у 2013 г. ардынарыем Віцебскай Рымска-каталіцкай дыяцэзіі, то прадпрыняў канкрэтныя дзеянні па ўзнаўленні касцёла. На сённяшні момант вядуцца прыгатаванні да адраджэння аднаго з найпрыгажэйшых касцёлаў Віцебска.*

***Ключавыя словы:*** *касцёл Святога Антонія, ксёндз, помнік архітэктуры.*

*(Ученые записки. – 2019. – Том 29. – С. 25–32)*

# The History of St. Anthony of Padua Church and Parish in Vitebsk

***Laurynenka K.V.***
*John Paul II Catholic University of Lublin (Poland)*

*The history of St. Anthony of Padua Church and parish in Vitebsk is an essential part of the history of the Roman Catholic Church in Belarus.*

*The purpose of this article is to examine the history of St. Anthony of Padua Church and parish in Vitebsk.*

***Material and methods.*** *This research is based on the use of a wide range of documents from the State Archive of Vitebsk Region, the sources published by the Roman Catholic Church and research papers. This allowed reconstructing the history of St. Anthony of Padua Church and parish in Vitebsk. The methodological basis is the principles of historicism and objectivity. Both general scientific (historical and logical, analysis and synthesis) and special historical (historical genetic and historical comparative) methods were used in the research.*

***Findings and their discussion.*** *The first Church of St. Anthony of Padua in Vitebsk was built in the 17th century as a convent church of the Bernardins. In the 18th century, the stone baroque church was erected. In the 19th century, the monastery of the Bernardins was dissolved and the Church became a parochial one. The fate of the Church in the 20th century was tragic. Almost all priests who served in the Church after 1917 were repressed and executed. In 1938 the parish ceased its existence. After the war, the Church was destroyed gradually, which is why it was not protected as a work of architecture anymore. In 1958 it was blown up. The parish of St. Anthony of Padua was revived in 2001.*

***Conclusion.*** *The parish priest of St. Anthony of Padua church in Vitebsk (since 2003) Fr. Aleh Butkievich was planning the reconstruction of the majestic Church in the center of Vitebsk. In 2013 he became the ordinary Bishop of the Vitebsk Roman Catholic diocese and initiated the concrete undertakings to revive one of the most beautiful churches in Vitebsk.*

***Key words:*** *St. Anthony of Padua Church, priest, work of architecture.*

*(Scientific notes. – 2019. – Vol. 29. – P. 25–32)*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: kasjal 1977@gmail.com –* ***К.В. Лаўрыненка***

Каталіцтва ў Віцебску мае моцныя і трывалыя пазіцыі. Ужо ў XIV стагоддзі, калі горад наведаў Ягайла разам са сваёй жонкай святой Ядвігай, тут знаходзіўся каталіцкі місіянер. Першы ж касцёл у горадзе – фарны – быў збудаваны дзякуючы вялікаму князю Вітаўту ў пачатку XV стагоддзя. У XVII стагоддзі ў Віцебск прыбылі езуіты, дамініканцы і бернардзінцы, а ў XVIII стагоддзі піяры і трынітарыі, якія пабудавалі тут свае кляштары і касцёлы пры іх. Такім чынам, акрамя фарнага касцёла, на 1772 год у Віцебску мелася 5 мужчынскіх кляштараў разам з касцёламі. Аднак у першай палове XIX стагоддзя ўсе кляштары былі ліквідаваны. У выніку змен у другой палове XIX стагоддзя ў Віцебску функцыянавалі толькі дзве парафіі – Святога Антонія Падуанскага і Святой Барбары. Такі ж стан рэчаў захаваўся і ў 1917 годзе. І менавіта касцёл і парафія Святога Антонія Падуанскага адыгралі найбольш значную ролю ў гісторыі каталіцкага Віцебска.

Мэта артыкула – разгледзець ролю і месца касцёла і парафіі Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне пабудавана на выкарыстанні шырокага кола дакументаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і крыніц, выдадзеных Рымска-каталіцкім Касцёлам, а таксама навуковых публікацый, што дазволіла рэканструяваць гісторыю касцёла і парафіі Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску.

Метадалагічную аснову склалі прынцыпы гістарызму і аб’ектыўнасці. У даследаванні выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя (гістарычны і лагічны, аналіз і сінтэз), так і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны) метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Гісторыя касцёла Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску бярэ свой пачатак з XVII ст., калі ў 1676 г. для патрэб манахаў-бернардзінцаў на Ратушнай плошчы стараннямі віцебскага ваяводы Яна Антонія Храпавіцкага, кальвініста, які навярнуўся ў каталіцтва на магіле святога Антонія Падуанскага ў Падуі, былі пабудаваны драўляны храм і кляштар.

У час Паўночнай вайны ў 1708 г. кляштар і касцёл былі спалены, аднак у 1730–1731 гг. адбудаваны. Праз два гады, 31 мая 1733 г., драўляныя касцёл і кляштар зноў згарэлі падчас пажару, што адбыўся ў Віцебску. Пасля гэтага пажару бернардзінцы амаль год карысталіся гасціннасцю езуітаў, пакуль не займелі свой кляштар. Нарэшце ў 1736 г. на сродкі Казіміра і Тэклі Саковічаў распачалося будаўніцтва мураванага касцёла і кляштара, завяршылася ў 1740 г. Касцёл і кляштар былі атынкаваны звонку і знутры, дах быў пакрыты гонтай. Трохпавярховы кляштар складаўся з трох карпусоў, якія былі размешчаны ў выглядзе літары П і далучаліся да касцёла такім чынам, што ўтваралі ўнутраны светлавы двор. З поўдня ля кляштара знаходзіўся вялізны гаспадарчы двор. Землі на ўсход ад касцёла да ракі Віцьба займаў вялікі сад, што належаў кляштару. На першым паверсе кляштара знаходзіліся глыбокія сутарэнні, келлі і пякарня. На другім паверсе, апроч келляў манахаў, размяшчаліся вялікая трапезная і кухня. На гэтым жа паверсе быў уваход у касцёл, праўда, на больш высокім, чым кляштар, узроўні. На трэцім паверсе знаходзіўся навіцыят, над трапезнай – бібліятэка [1, с. 9–10].

Касцёл рэзка адрозніваўся ад прымыкаючых да яго кляштарных пабудоў. Трохнефавы будынак меў толькі чатыры ўнутраныя апоры, дзякуючы чаму яго вонкавы контур плана без сакрыстый абапал галоўнага алтара быў блізкі да квадрата. У адрозненне ад большасці касцёлаў Беларусі вонкавы фасад гэтага храма меў рысы, якія развіваліся ў шырыню. Верагодна, што месца, на якім стаяў храм, абумовіла і невялікую працягласць касцёла ў глыбіню [1, с. 10].

У 1768 г. касцёл быў кансэкраваны ў гонар святога Антонія Падуанскага біскупам-суфраганам Феліксам Тавяньскім.

Каля 1820 г. у віцебскі кляштар з Нясвіжа часова быў перанесены навіцыят Літоўскай правінцыі, які знаходзіўся да 1827 г. На той час тут налічвалася 9 манахаў, хаця звычайна іх служыла менш. Так, у 1832 г. у кляштары было толькі тры манахі [2, s. 337–338].

У тым жа 1832 г. кляштар бернардзінцаў ліквідаваны, аднак клер застаўся. Пазней у касцёле пачалі служыць дыяцэзіяльныя святары. Да 1841 г. касцёл называлі пакляштарным. Першапачаткова касцёл Святога Антонія функцыянаваў як філіяльны, і толькі ў 1843 г. тут была ўтворана самастойная парафія. З 1854 г. пачынае падавацца колькасць вернікаў парафіі (праўда, не заўсёды дакладная) – 4575.

У парафіі Святога Антонія ў свой час служылі некалькі знакавых для Рымска-каталіцкага Касцёла асоб. Так, у 1884–1885 гг. абавязкі вікарыя выконваў Слуга Божы ксёндз Антоні Малецкі (1861–1884–1926–1935), з 1926 г. дапаможны біскуп Магілёўскі і першы Апостальскі адміністратар Ленінграда.

У 1888–1889 гг. вікарыем у парафіі служыў ксёндз Казімір Міхалькевіч (1.02.1865–1888–

1923–1940), у 1908–1917 гг. адміністратар Віленскай дыяцэзіі, з 1923 г. біскуп-суфраган Віленскай дыяцэзіі.

З 11 кастрычніка 1896 па 8 кастрычніка 1903 г. абавязкі прэфекта мужчынскай і жаночай гімназій, а таксама прыватнага сямігадовага пансіёна выконваў Слуга Божы ксёндз Канстанцін-Рамуальд Будкевіч (9.06.1867–26.09.1893–1.04.1923, Масква, турма АДПУ) [3, с. 45]. Шмат намаганняў святар прысвяціў працы каталіцкага Таварыства дабрачыннасці, якое дзейнічала ў Віцебску. У сакавіку 1923 г. святар быў арыштаваны ў Маскве па групавой справе каталіцкага духавенства разам з арцыбіскупам Янам Цяплякам і благаслаўлёным, на той момант дыяцэзіяльным святаром, Тэафілюсам Матулёнісам, затым асуджаны і расстраляны.

У 1861 г. парафія налічвала 4034 вернікі. На яе тэрыторыі знаходзіліся капліцы ў мясцовасцях Гародня, Цехаўка, Лужын, Хоцімль, Лявонтава, Скуратава і Ледцы, а таксама філіяльны касцёл у Віцебску пад тытулам святога Міхала Арханёла [4, с. 89].

У 1901 г. парафія налічвала 4443 вернікі, у 1912 г. – 5000, у 1917 г. – 5100 [5, с. 191; 6, с. 175; 7, с. 162]. На 1917 г. у парафіі меліся капліцы ў мясцовасцях Гародня, Цехаўка, Лужын, Хоцімль, Лявонтава, Скуратава, Сэрца.

Неабходна адзначыць, што парафіянамі касцёла Святога Антонія была большасць каталікоў Віцебска [8, s. 366].

5–7 верасня 1909 г. у Віцебску адбылася кананічная візітацыя біскупа Стэфана Данісевіча, у час якой ён удзяліў сакрамэнт канфірмацыі 1629 вернікам [9, s. 138]. Трагічна склаўся лёс святароў, якія служылі ў касцёле Святога Антонія пасля 1917 г.

У 1916–1919 гг. адміністратарам парафіі быў ксёндз Вінцэнт Балюль (1874–1899–13 ці 31.8.1944). У 1919 г. святар быў арыштаваны як закладнік, аднак праз некаторы час вызвалены. У 1921 г. ксёндз Балюль выехаў у Польшчу [10, с. 36].

У 1919–1921 гг. адміністратарам парафіі з'яўляўся ксёндз Уладзіслаў Жаўняровіч (20 ці 26.12.1885–1915–5.10.1937), які дагэтуль у 1916–1918 гг. быў вікарыем у парафіі. Уначы з 26 на 27 лютага 1927 г., афіцыйна пробашч парафіі Абольцы, святар арыштаваны ў Віцебску і асуджаны калегіяй АДПУ 18 красавіка таго ж года за "антысавецкую агітацыю" і "выдаванне сакрэтных звестак" да пяці гадоў пазбаўлення волі. Пакаранне ксёндз Жаўняровіч адбываў у Салавецкім лагеры АДПУ Карэльскай АССР. У 1930 г. зняволенне святару было заменена трохгадовай высылкай, падчас якой ён знаходзіўся ў Краснаярскім краі. Ксёндз Жаўняровіч быў вызвалены 3 мая 1933 г. З 1934 г. ён жыў у Веліжы Смаленскай вобласці, дзе і быў паўторна арыштаваны 20 жніўня 1937 г., а 27 верасня прыгавораны да вышэйшай меры пакарання і расстраляны [10, с. 170–171].

Наступны адміністратар парафіі ў 1922–1925 гг. (у 1915–1922 гг. вікарый) ксёндз Леанард Бараноўскі (1875–1900–12.12.1930) арыштаваны 4 ліпеня 1922 г. як закладнік, аднак праз 3 тыдні вызвалены, працягваў сваё служэнне ў касцёле. Наступны раз святар быў арыштаваны 5 лютага 1925 г. у Віцебску і 26 чэрвеня 1925 г. асуджаны калегіяй АДПУ як "агент польскай разведкі", а таксама за "дапамогу нелегальнаму выезду людзей у Польшчу" да 3 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў Салавецкі лагер. Аднак пасля сканчэння тэрміну 13 ліпеня 1928 г. пастановай асобай нарады АДПУ святар быў высланы на 3 гады ў Сібір, дзе і памёр ад тыфу ў в. Тагур Томскай акругі Нарымскага краю [10, с. 44].

Ксёндз Ян Францук (1.6.1891–1915 – пасля 1948), які служыў пры парафіі ў 1916–1920 гг., спачатку як прэфект, затым як вікарый, быў арыштаваны 4 мая 1920 г. і асуджаны калегіяй асобага аддзела Заходняга фронту як "удзельнік польскай шпіёнскай арганізацыі" да 3 гадоў пазбаўлення волі. Быў этапаваны ў Смаленскі палітычны ізалятар НК, потым у Маскву, Нова-Пяскоўскі лагер НК. Святар вызвалены ў лютым 1921 г. па хадайніцтве Чырвонага Крыжа і ў 1922 г. выехаў у Польшчу [10, с. 415–416]. Ксёндз Юзаф Ворслаў (28.8.1886–1910–1937?), вікарый у 1919–1920 гг., паводле некаторых звестак быў арыштаваны ў 1937 г. і расстраляны [10, с. 97].

У 1922–1925 гг. і, верагодна, каля 1926–1929 гг. вікарыем пры парафіі быў ксёндз Пётр-Бярнард Капуста (14.03.1886 ці 1891–1917–1.11.1937, ст. Мядзведжая Гара, Сандармох Карэльскай АССР). Служыў у Мазыры, арыштаваны 25 снежня 1930 г. Быў асуджаны калегіяй АДПУ 23 жніўня 1931 г. за "правядзенне антысавецкай агітацыі" і як "кіраўнік контррэвалюцыйнай шпіёнскай арганізацыі" да 10 гадоў пазбаўлення волі. Этапаваны ў Салавецкі лагер. Тройкай НКУС Ленінградскай вобласці прыгавораны 10 кастрычніка 1937 г. да расстрэлу [10, с. 209].

У 1921 г. прызначэнне ў парафію і адначасова ў касцёл Святой Барбары ў якасці вікарыя атрымаў ксёндз Стэфан Трускоўскі (2.9.1896–1921–1.3.1959), якому перад гэтым патаемна ўдзяліў прэзбітэрскае пасвячэнне арцыбіскуп Ян Цэпляк. Падчас правядзення кампаніі па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей святар адмовіўся аддаваць богаслужэбныя рэчы з касцёла Святой Барбары і Святога Антонія [11, ф. 70, воп. 1, спр. 24, л. 31], за што быў арыштаваны ў 1922 г., асуджаны да 5 гадоў пазбаўлення волі і вывезены ў Бутырскую турму Масквы. Затым святар быў вызвалены ў выніку абмену палітвязнямі паміж Польшчай і СССР і 28 красавіка 1924 г. выехаў з СССР [10, с. 406].

6 ліпеня 1925 г. пробашчам касцёла Святога Антонія Падуанскага і касцёла Святой Барбары, а таксама дэканам у Віцебску быў прызначаны ксёндз Пётр Аўгла (11.5.1861–11.2.1887–27.8.1937, Магілёў, турма НКУС). У Віцебску святар паўторна арыштаваны ў 1927 г. (першы раз у 1922–1923 гг.), і абвінавачаны ў “шпіянажы на карысць Польшчы” і “контррэвалюцыйнай агітацыі”. Каля 200 дзён святар правёў у смаленскай турме АДПУ. Пасля вызвалення ксёндз Аўгла быў прызначаны генеральным вікарыем біскупа Слосканса. 15 чэрвеня 1937 г. святар зноў арыштаваны, 25 жніўня прыгавораны “тройкай” НКУС да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці і расстраляны [10, с. 25–27].

14 лістапада 1926 г. менавіта ў касцёле Святога Антонія Магілёўскі генеральны вікарый ксёндз Вітальд Пашкевіч, будучы разам са Слугой Божым, новапрызначаным біскупам Баляславам Слоскансам, Апостальскім адміністратарам у Магілёве, абвесціў аб ягоным прызначэнні [12, с. 376]. Дарэчы ксёндз Баляслаў Слосканс служыў кароткі час яшчэ як звычайны святар у канцы 1924 – першай палове 1925 г. у віцебскім касцёле Святой Барбары, дапамагаў у душпастырскай дзейнасці ў парафіі Святога Антонія. Сведчыць аб гэтым той факт, што ў час просьбы ва ўлад дазволу на прыбыццё з Полацка ксяндза Адольфа Філіпа на фэст у гонар святога Антонія 13 чэрвеня 1925 г. сярод духавенства, што служыць пры парафіі, былі названы ксяндзы Шукель і Слосканс [11, ф. 118, воп. 4, спр. 34, л. 180].

У 1927–1930 гг. адміністратарам парафіі з’яўляўся ксёндз Юзаф Вярыга (1866 ці 1867–1891 – пасля 1933), які дагэтуль, у 1922–1925 гг., быў вікарыем. Святар арыштаваны 28 лютага 1933 г. у Віцебску і асуджаны 5 мая 1933 г. асобай нарадай пры АДПУ за “антысавецкую агітацыю і як арганізатар антысавецкай арганізацыі” да 3 гадоў высылкі ў Казахстан, дзе і загінуў [10, с. 104].

Наступным адміністратарам парафіі ў 1930 г. быў прызначаны ксёндз Ігнат Шукель (1877–1903–1935?). Святар арыштаваны 19 кастрычніка 1930 г. і асуджаны 4 ліпеня 1931 г. паводле пастановы калегіі АДПУ як “кіраўнік контррэвалюцыйнай арганізацыі ПАВ” да вышэйшай меры пакарання (заменена на 10 гадоў пазбаўлення волі). Затым ксёндз Шукель быў этапаваны ў Салавецкі лагер, дзе і загінуў [10, с. 449].

Летам 1933 г. у Віцебск прыехаў ксёндз Язэп Барадзюля (4.9.1893–1919–27.9.1983), вызвалены пасля першага арышту. Святар арыштаваны ў Камена-Губінскім касцёле 29 снежня 1926 г. прадстаўніком Мінскага АДПУ, зняволены ў Лепельскай турме АДПУ, затым 1 студзеня 1927 г. перавезены ў Мінскую ўнутраную турму АДПУ. Абвінавачваўся ў “выкладанні веравучэння малалетнім” і “выкарыстанні рэлігійнага вучэння з мэтай звяржэння савецкай улады”. Быў асуджаны калегіяй АДПУ 4 сакавіка 1927 г. да 3 гадоў пазбаўлення волі і этапаваны ў Салавецкі лагер. У 1930 г. пасля сканчэння тэрміну высланы ў Архангельск, адкуль за душпастырскую дзейнасць яго накіравалі далей на Поўнач. Толькі летам 1933 г. святар вызвалены, пасля чаго прызначаны пробашчам касцёла Святога Антонія і касцёла Святой Барбары. У Віцебску святар праслужыў толькі два тыдні на працягу кастрычніка. Пасля адмовы супрацоўніцтва з АДПУ уканцы 1933 г. ксёндз Барадзюля зноў быў высланы ў Архангельск [10, с. 41–42; 13, с. 16].

У 1934–1935 гг. наступным адміністратарам парафіі з’яўляўся ксёндз Эўгеніюш Крулікоўскі (1875–1899–1935) [14, с. 41].

Апошнім святаром, што служыў у касцёле Святога Антонія ў міжваенны час, быў ксёндз Адольф Філіп (5.1.1885 ці 1886–1909–1937). Пасля адбыцця 10-гадовага тэрміну на Салаўках святар быў вызвалены і ў лістападзе 1936 г. прыехаў у Віцебск, дзе 28 сакавіка 1937 г. адслужыў у касцёле Святога Антонія апошнюю рэзурэкцыю перад закрыццём святыні [15, с. 212]. У жніўні 1937 г. ксёндз Філіп зноў арыштаваны, асуджаны да вышэйшай меры пакарання і расстраляны [10, с. 413–414].

У 1938 г. з дапамогай падатковага ціску Віцебскі гарсавет забраў касцёл у вернікаў [16, с. 79]. На вызвалены будынак прэтэндавалі Віцеб-

скі абласны гістарычны музей і Віцебскі абласны медыцынскі інстытут. Летам 1939 г., нягледзячы на тое, што пастанова ВЦВК і СНК ад 10 жніўня 1933 г. аб ахове гістарычных помнікаў забараняла выкарыстоўванне архітэктурных помнікаў пад любыя мэты, акрамя музеяў, касцёл быў перададзены Віцебскаму медінстытуту, які пачаў перарабляць яго пад фізкультурную залу.

Аднак тыя, хто разумеў каштоўнасць касцёла як архітэктурнага помніка, пачалі выказваць занепакоенасць, што гэта знішчыць помнік. 20 лістапада 1939 г. касцёл як помнік архітэктуры быў узяты на ўлік урадавай навуковай экспедыцыяй па перапісе і пашпартызацыі помнікаў рэвалюцыі, гісторыі і мастацтва. 17 снежня 1939 г. камісія ў складзе прадстаўнікоў Віцебскага абласнога камітэта КП(б)Б, Віцебскага абласнога гістарычнага музея, начальніка навуковай экспедыцыі па перапісе помнікаў рэвалюцыі, мастацтва і гісторыі, абласнога аддзела Савета ваяўнічых бязбожнікаў і Віцебскага гарсавета здзейсніла агляд будынка касцёла. Прадстаўнікі камісіі адзначылі, што, нягледзячы на тое, што касцёл стаіць пусты параўнальна нядаўна, тым не менш ужо адзначаліся прыкметы разбурэння: паравы кацёл быў завалены вапнай, ацяпляльныя трубы захаваліся толькі ўнутры, архітэктурныя ўпрыгожванні звонку будынку пачалі сапсавацца і разбурацца, унутраныя архітэктурныя ўпрыгожванні, скульптуры і жывапіс “знішчаюцца злой рукой”, будынак пачынае пакрысе “перабудоўвацца”. У адной з сакрыстый была абсталявана кватэра, прабіта шырокае акно. Іншыя памяшканні пачалі выкарыстоўвацца як сховішча. Гэтая ж экспедыцыя ўзняла пытанне перад урадавай камісіяй пры СНК БССР аб перадачы будынка Віцебскаму абласному гістарычнаму музею [11, ф. 1947, воп. 1, спр. 103, л. 9].

21 лютага ўрадавая камісія па пашпартызацыі помнікаў гісторыі і мастацтва ў складзе начальніка экспедыцыі Юркі Віцьбіча і архітэктара М. Мельніка другі раз агледзела касцёл і склала па выніках агляду акт. Знамянальна, што ў гэтым акце адзначалася наступнае: “…узяты нашай экспедыцыяй на ўлік касцёл выпадкова ацалеў ад злачыннай дзейнасці ворагаў народа, якія, прыкрываючыся “левымі” фразамі, узарвалі аманалам помнікі мастацтва”. Камісія сцвярджала, што будынак прадстаўляе выключную каштоўнасць як помнік двух архтэктурных стыляў – звонку ён вытрыманы ў стылі барока, унутры – у стылі рэнесансу. Канстатавалася, што помнік пачынае разбурацца, а наконт планаў медінстытута прыстасаваць левы неф касцёла пад фізкультурную залу адзначалася, што гэта незваротна пашкодзіць будынак, бо ўсталяванне сістэмы абагрэву і прабіццё новых вокнаў знішчыць фрэскі. Гэты ж акт дае ўяўленне, што на той момант яшчэ захавалася ў касцёле – гэта амбон, алтары, фрэскі, якія яшчэ не страцілі сваёй яркасці, на бакавых алтарах захаваліся два абразы – святога Язафата Кунцэвіча і Папы Урбана XIII, аднак вітраж з выявай Маці Божай быў часткова пашкоджаны. У гэтым акце камісія абгрунтоўвала неабходнасць перадачы касцёла пад Антырэлігійны музей [11, ф. 1947, воп. 1, спр. 103, л. 10–14].

19 сакавіка 1940 г. Віцебскі гарсавет перадаў касцёл Віцебскаму гістарычнаму музею для арганізацыі антырэлігійнага філіяла музея, які было прапанавана адчыніць ужо 1 мая 1940 г. [11, ф. 1947, воп. 1, спр. 103, л. 23]. Паколькі Віцебскі медінстытут распачаў рамонт касцёла, у прыватнасці, былі зашклёныя ўсе вокны, таму ягоныя прадстаўнікі запатрабавалі ад музея вяртання грошай, патрачаных на рамонт у суме 2926 рублёў 96 капеек [11, ф. 1947, воп. 1, спр. 103, л. 43].

Акт ад 2 красавіка 1940 г. апісвае, у якім стане тады знаходзіўся касцёл: у многіх месцах атынкоўка як звонку, так і ўнутры асыпалася, шмат дзе выбіта шкло. У двары было шмат смецця і вапны. Унутры пры ўваходзе ў касцёл знаходзіліся дзве вялікія кучы смецця, на падлозе былі бітае шкло, цэгла і атынкоўка. Мастацкія скульптурныя ўпрыгожванні, за рэдкім выключэннем, амаль усе былі пашкоджаныя (адбіты галовы, рукі і ногі і г.д.), паўкруглае акно над другімі ўваходнымі дзвярыма з вітражом Маці Божай з каляровага шкла было пашкоджана з правага боку, быў выбіты вітраж ва ўнутраных уваходных дзвярах. Унутраныя дзверы і дзверы шаф у большасці былі ўзламаны і разбураны. Левая сакрыстыя выкарыстоўвалася пад жыллё. Ва ўсіх памяшканнях валяліся абломкі. Запацелыя сцены былі вільготныя і цяклі, ад нераўнамернай тэмпературы і вільгаці насценныя і столевыя фрэскі ў некаторых месцах патрэскаліся і верхні слой фарбы разам з вапнай асыпаўся. Падлога ў некаторых месцах прагніла і патрабавала замены. Усе абразы і рэлквіі, за выключэннем дзвюх, намаляваных на сцяне, адсутнічалі. Сходні на званіцу месцамі былі пашкоджаны. Арган паламаны, усе ягоныя металічныя часткі і арганныя мяхі адсутнічалі, засталася толькі драўляная аснова [11, ф. 1947, воп. 1, спр. 103, л. 36–36а].

У Антырэлігійным музеі сярод іншага былі змешчаны рэліквіі святой Еўфрасінні Полацкай.

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны вернікі паўбіралі са святыні антырэлігійныя экспанаты, касцёл зноў дзейнічаў. Рэліквіі св. Еўфрасінні былі вернуты ў Полацк.

Не захаваліся звесткі пра святароў, якія падчас Вялікай Айчыннай вайны служылі ў касцёле Святога Антонія. Верагодна, па чарзе іх змянілася некалькі.

Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў касцёл зноў быў зачынены.

Пра стан касцёла ў пасляваенны час сведчыць акт ад 10 лютага 1946 г., складзены па выніках агляду будынку інжынерамі-будаўнікамі. Паводле гэтых звестак паверхня фасада мела дробныя пашкоджанні, меліся сляды ад куль і асколкаў. Верхні карніз у фасаднай частцы касцёла быў разбураны на 90 працэнтаў і толькі невялікай працягласці астаткі карніза, што ўцалелі, давалі ўяўленне аб ягонай форме да разбурэння. Сярэдні карніз меў пашкоджанні на 50 працэнтаў, задні фасад касцёла, сярэдняя траціна якога з’яўлялася алтарнай часткай касцёла, быў амаль не пашкоджаны, калі не лічыць разбурэння верхняга карніза на 50 працэнтаў. Купальная частка касцёла, а разам з ёй увесь дах былі знесены, што скажала сапраўднае аблічча помніка. Меўся алтар, ягоныя скульптуры былі пашкоджаны на 50 працэнтаў, аднак адзначалася, што іх можна адрэстаўрыраваць. Таксама дастаткова захаваліся інтэр’еры, упрыгожанні і роспісы, а на сценах і зводах касцёла – жывапіс алеем і лепныя ўпрыгожанні. Фундамент касцёла быў не пашкоджаны. Сцены разбурэнняў у асноўным не мелі, зала касцёла была перакрыта цагляным скляпеннем, якое мела частковыя пашкоджанні, сістэма скляпенняў алтарнага перакрыцця была пакрыта сеткай дробных расколін. Паколькі ў касцёле адсутнічаў дах, а пры гэтым меліся два выцяжныя вокны, таму ў будынак траплялі ападкі. Такім чынам, паводле заключэння спецыялістаў, касцёл меў пашкоджанні на 30 працэнтаў, але з поспехам мог быць адноўлены. Кошт помніка ў тым тэхнічным стане ацэньваўся ў 1950000 рублёў [11, ф. 2820, воп. 4, спр. 7, л. 77–79].

Яшчэ ў 1947 і 1949 гг. касцёл Святога Антонія быў у спісе помнікаў архітэктуры Беларускай ССР, якія знаходзіліся пад аховай дзяржавы [11, ф. 2820, воп. 4, спр. 7, л. 43, 75]. Тым не менш будынак быў перададзены Віцебскаму “Гархарчгандлю”, які выкарыстоўваў яго пад склад гароднiны, што моцна разбурала касцёл. Пры гэтым упраўленне па справах архітэктуры манітарыла дадзеныя аб стане касцёла, які неаднаразова абследаваўся. Пасля абследавання 8 красавіка 1949 г. упраўленне па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў БССР 21 красавіка таго ж года даслала дырэктару Віцебскага “Гархарчгандлю” заяву, дзе канстатавалася, што “арандатар абуральна адносіцца да захавання каштоўнага помніка архітэктуры – будынак не рамантуецца, дах разбураецца і скляпенні пагражаюць абрынуцца, фасад знявечаны”. Копіі гэтага дакумента былі дасланы старшыні Віцебскага гарсавета дэпутатаў працоўных і начальніку Віцебскага абласнога аддзела па справах архітэктуры. Упраўленне прапанавала неадкладна распачаць рамонт будынка, дзеля чаго было неабходна скласці каштарыс і праект аднаўлення, узгадніўшы гэта з Віцебскім абласным архіўным аддзелам [11, ф. 2820, воп. 4, спр. 7, л. 60].

Паступовае знішчэнне касцёла ў выніку неадпаведнай эксплуатацыі прывяло да таго, што ўжо 29 лістапада 1950 г. упраўленне па справах архітэктуры пры Савеце Міністраў Беларускай ССР, дасылаючы начальніку Віцебскага абласнога аддзела па справах архітэктуры спіс помнікаў, адносна якіх трэба было прыняць рашэнне – пакідаць іх у спісе помнікаў ці не, прымаючы пад увагу, між іншым, такія крытэрыі, як архітэктурная і гістарычная нязначнасць, а таксама дрэнная захаванасць, рэкамендавала касцёл Святога Антонія з гэтага спіса выключыць [11, ф. 2820, воп. 4, спр. 7, л. 79–80].

2 красавіка 1952 г. камісія ў складзе прадстаўнікоў упраўлення па справах архітэктуры як рэспубліканскага, так і абласнога ўзроўню агледзела некаторыя помнікі архітэктуры г. Віцебска, каб вырашыць пытанне аб мэтазгоднасці іх пакінуць ў новым спісе помнікаў архітэктуры БССР рэспубліканскага значэння, сярод якіх быў і касцёл Святога Антонія. Камісія канстатавала, што ўсе агледжаныя помнікі падчас вайны атрымалі моцныя пашкоджанні, працэнт іх разбурэння дасягае 80–90 працэнтаў. Апошнія абставіны, на думку членаў камісіі, узнімалі пытанне: ці з’яўляецца іх аднаўленне магчымым і рацыянальным? З гэтай прычыны камісія палічыла, што, паколькі гэтыя помнікі страцілі ўсялякую каштоўнасць, таму немэтазгодна ўносіць іх у новы спіс помнікаў архітэктуры рэспубліканскага значэння [11, ф. 2820, воп. 4, спр. 7, л. 87].

Нягледзячы на тое, што ў Віцебску не было ніводнага дзеючага касцёла, нелегальна рэлігій-

нае жыццё працягвалася. Час ад часу нешматлікія віцебскія вернікі збіраліся на малітвы без святара. Неаднаразова з душпастырскай паслугай у 1958–1959 гг. да вернікаў Віцебска прыязджаў ксёндз Віктар Шутовіч з Барысава. Ён затрымліваўся ў хаце адной з веруючых і ўдзяляў сакрамэнты [11, ф. 4029, воп. 2, спр. 9, л. 69].

Пры магчымасці віцебскія вернікі выязджалі для прыняцця сакрамэнтаў у касцёлы Літвы і Латвіі. Адначасова яны спрабавалі вярнуць сабе святыню. У кастрычніку 1956 г. дзве жанчыны-каталічкі з г. Віцебска звярнуліся да ўпаўнаважанага ў справах рэлігійных культаў па пытанні рамонту і адкрыцця касцёла ў горадзе. Зразумела, што вяртаць касцёл вернікам улады не планавалі, таму ўпаўнаважаны паведаміў: калі вернікі гэтага жадаюць, то павінны адрамантаваць касцёл за ўласны кошт [11, ф. 4029, воп. 2, спр. 6, л. 21].

Раніцай 15 красавіка 1958 г. касцёл Святога Антонія быў узарваны [11, ф. 322, воп. 7, спр. 43, л. 32–33].

У 1987 г. на месцы касцёла быў устаноўлены фантан "Зліццё трох рэк".

У 1989 г. на Беларусі адбылося адраджэнне структур Каталіцкага Касцёла. У 1990 г. пасля прыезду ў Віцебск святара дамініканца Януша Скэнчэка пачала дзейнічаць парафія Святой Барбары. Пасля ўтварэння ў 1999 г. Віцебскай дыяцэзіі адзіная да таго часу віцебская парафія Святой Барбары была падзелена на некалькі, у выніку парафія Святога Антонія Падуанскага ў Віцебску была адроджаная 1 красавіка 2001 г. Арганізацыя новай парафіі была даручана манахам-францішканам канвентуальным з Панеўнік, планавалася, што тут будзе служыць айцец Сабін Яцэк Тлок OFM, аднак па стане здароўя ён працу не распачаў. Фактычна асноўны цяжар працы прыйшоўся на плечы дыякана Аляксандра Амяльчэні, які быў дасланы сюды на дыяканскую практыку.

10 чэрвеня 2001 г. пасля ўрачыстай святой Імшы для парафіі быў асвечаны абраз святога Антонія Падуанскага, намаляваны мясцовым мастаком Эдуардам Галуставым. 21 чэрвеня 2001 г. парафія была зарэгістравана.

Першапачатковa Імша для парафіян цэлебравалася ў касцёле Святой Барбары. 16 жніўня 2002 г. парафія атрымала ўласны будынак – былы Дом культуры, што належаў Віцебскаму вучэбна-вытворчаму прадпрыемству "Галант" па вуліцы Гагарына, 46а.

Будынак знаходзіўся ў жахлівым стане – працякаў дах, сцены і падлога былі абшарпаны. Перш чым узяцца за рамонт будынка, Віталій Кучынскі, другі старшыня касцёльнага камітэта, разам з іншымі вернікамі ўсталяваў на будынку вялізны крыж. Адбылося гэта ў свята Узвышэння Святога Крыжа – 14 верасня 2002 г. Разам з братам жонкі ён зварыў крыж у падвале свайго дома, да будынка касцёла вернікі перанеслі яго на руках, а затым на вяроўках усцягнулі па сцяне наверх. Адначасова Віталій Кучынскі зрабіў яшчэ адзін крыж – драўляны, усталяваны на сцяне прэзбітэрыя [17].

Першым пробашчам парафіі быў прызначаны ксёндз Анджэй Бочар MS, які выконваў свае абавязкі ад жніўня 2002 да верасня 2003 г. Абавязкі вікарыя ў парафіі ў 2002 г. выконвалі ксёндз Віталій Галец і ксёндз Аляксандр Рагіня.

21 верасня 2003 г. душпастырскую паслугу ў парафіі распачаў ксёндз Алег Буткевіч, які заняўся грунтоўнай перабудовай будынка клуба на сакральны аб'ект.

Вікарыямі ў парафіі ў час служэння ксяндза Буткевіча былі: у 2004 г. – ксёндз Віктар Місевіч, у 2009 г. – ксёндз Ян Пугачоў, у 2012–2013 гг. – ксёндз Антон Лагунёнак.

29 лістапада 2013 г. ксёндз Алег Буткевіч быў прызначаны новым ардынарыем Віцебскай дыяцэзіі. 18 студзеня ў катэдральным касцёле яму была ўдзелена біскупская сакра, а ўжо на наступны дзень ён цэлебраваў першую Імшу ў парафіі ў якасці біскупа.

23 лютага 2014 г. біскуп Алег Буткевіч прадставіў у парафіі яе новых пастыраў – пробашча ксяндза Вячаслава Барка і вікарыя айца Станіслава Памыкалу SJ (скончыў служэнне ў парафіі летам 2017 г.). Менавіта ксёндз Вячаслаў Барок і завяршыў рамонтную работу ў касцёле. Роспісы ў святыні выканаў мастак Уладзімір Кандрусевіч.

11 чэрвеня 2017 г. біскуп Віцебскі Алег Буткевіч здзейсніў кансэкрацыю касцёла.

**Заключэнне.** Доўгі час пробашч адроджанай парафіі Святога Антонія ксёндз Алег Буткевіч марыў аб аднаўленні касцёла на яго гістарычным месцы. Калі ён стаў у 2013 г. ардынарыем Віцебскай Рымска-каталіцкай дыяцэзіі, то з дапамогай сённяшняга пробашча касцёла Святога Антонія ксяндза Вячаслава Барка распачаў падрыхтоўку да гэтай высакароднай справы. Ужо ў 2015 г. Міністэрства культуры прыняло рашэнне, што не будзе супраць рэканструкцыі будынка са змяшчэннем па восі фундамента, паколькі аднавіць касцёл на ранейшым месцы азначае выйсці на праезджую частку вуліцы [18].

У 2017 г. была створана “Эскізная прапанова па аднаўленні касцёла Святога Антонія”. Падрыхтаваў яе архітэктар Ігар Радзько, вядомы ў горадзе спецыяліст, што працаваў над рэканструкцыяй многіх гістарычных будынкаў цэнтра. На сённяшні момант парафія атрымала афіцыйны дазвол на выкананне навукова-даследчых і праектных работ. Па аднаўленні касцёла вядуцца перадпраектныя работы. Паколькі дагэтуль у гістарычных архівах не знойдзены праект касцёла, ягонае аднаўленне будзе абапірацца на апісанні, якія захаваліся да гэтага часу. Дзякуючы адбудове касцёла Святога Антонія ажыве адзіны архітэктурны ансамбль былой Ратушнай плошчы.

## Літаратура

1. Квітніцкая, А. Прыёмы фарміравання гандлёва-адміністрацыйнага цэнтра Віцебска ў 18 ст. / А. Квітніцкая // Віцебскі сшытак. – 1995. – № 1. – С. 8–12.
2. Witebski dekanat // Podręczna encyklopedya kościelna. T. XLI–XLII. – Warszawa, Lublin, Łodź, 1915.
3. Чаплицкий, Б. О. Константин Будкевич (1867–1923). Жизнь и деятельность / пер. с пол. С. Карпенок, Т. Захарова; под ред. Т. Захаровой. – СПб.: Речь, 2004.
4. Directorium horarum canonicarum et missarum pro archodioecesi Mohiloviensi in annum Domini MDCCCLXI. – Vilnae: Typis Jusephi Zawadzski, 1860.
5. Directorium divini officii et missarum pro archodioecesi Mohiloviensi nec non pro dioecesi Minscensi in annum Domini 1901. – Vilnae: Typis Juseph Zawadzski, 1900.
6. Directorium divini officii et missarum pro archodioecesi Mohiloviensi nec non pro dioecesi Minscensi in annum Domini bissexstilem 1912. – СПб.: С.-Петерб. Губернская Типографія, 1912.
7. Directorium divini officii et missarum pro archodioecesi Mohiloviensi nec non pro dioecesi Minscensi in annum Domini 1917. – Druk: Tow. Akc. Sztuki drukarskiej w Piotrogradzie.
8. Nasze kościoły. T. 1. Część 3: Archidecezja Mohylowska. Witebszczyzna. – Warszawa: Biblioteka Narodowa, 2001.
9. Kościół w Rosji i na Białorusi w relacjach duszpasterzy (1892–1926) / Wybór tekstów i opracowanie ks. Marian Radwan SCJ. – Kraków: Wydawnictwo Księży Sercanów SCJ.
10. Маракоў, Л. Рэпрэсіраваныя каталіцкія духоўныя, кансэкраваныя і свецкія асобы Беларусі 1917–1964 / Л. Маракоў. – Мінск: “Смэлтак”, 2009.
11. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці.
12. Гарбінскі, Ю. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX ст. / Ю. Гарбінскі; навук. рэд. савет: У. Конан (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: МЮК “Беларускі кнігазбор”, 1999.
13. Ксёндз Язэп Барадзюля. Дваццаць пяць гадоў турмы, лагераў і ссылкі / ксёндз Язэп Барадзюля // Наша вера. – 1995. – № 1. – С. 12–18.
14. Fibek, J. Dzieje parafii i klasztorów katolickich na Białorusi. Część 1: Diecezja Witebska. Tom 1: Wschodnia część diecezji Witebskiej / J. Fibek. – Lomża: Zakon Braci Mniejszych Kapucynów, Prowincja Warszawska, 2016.
15. Dzwonkowski, R. SAC. Religia i Kościół katolicki w ZSSR oraz w krajach i na ziemiach okupowanych 1917–1991. Kronika / R. Dzwonkowski. – Lublin: Tow. Naukowe KUL, 2010.
16. Віцьбіч, Ю. Не змоўклі віцебскія арганы / Ю. Віцьбіч // Наша вера. – 1995. – № 1. – С. 78–79.
17. Лаўрыненка, К. “Мы танцавалі ў гэтым клубе на выпускным, а сёння тут касцёл”: у Віцебску асвяцілі касцёл Св. Антонія [Электронны рэсурс] / К. Лаўрыненка. – Рэжым доступу: catholic.by. – Дата доступу: 13.06.2017.
18. Лаўрыненка, К. Міністэрства культуры не бачыць перашкодаў, каб касцёл Св. Антонія быў адбудаваны [Электронны рэсурс] / К. Лаўрыненка. – Рэжым доступу: catholic.by. – Дата доступу: 09.12.2015.

*Паступіў у рэдакцыю 20.05.2019 г.*